знаний и переживаний (эмоций и чувств), которое позволяет говорить о возможности формирования у них основ ответственного отношения к природе.

Таким образом, становление природоохранной деятельности детей по предмету «Человек и мир» находится в прямой зависимости от развития экологического образования и воспитания на всех уровнях обучения, в том числе его начального звена.

Список использованной литературы

1. Барковская, О. М. Содержание, цель и задачи программы начального экологического воспитания / О. М. Барковская // Начальная школа. – 2009. – № 2. – С. 32–33.

2. Беладина, И. Г. Планета наш дом. Мир вокруг нас : Методика проведения занятий по основам экологии для дошкольников и младших школьников / И. Г. Беладина, Н. Г. Найденская. – М. : Лайда, 2013. – 96 с.

## ЭКСКУРСІЯ ЯК СРОДАК ВЫВУЧЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ (НА КРАЯЗНАЎЧЫМ МАТЭРЫЯЛЕ ГОРАДА МАЗЫРА)

**Белягова Юлія (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – П. Р. Кошман, канд. філал. навук, дацэнт**

Глабалізацыя сучаснага свету, дамінаванне ў ім масавай культуры выклікаюць пагрозу знікнення культурнай спадчыны народаў. Дадзеныя тэндэнцыі непасрэдна закранаюць сферы адукацыі, у якой асаблівую актуальнасць набываюць пытанні вывучэння нацыянальнай культуры, далучэння да яе сучасных школьнікаў. Так, Кодэкс аб адукацыі Рэспублікі Беларусь вызначае неабходнасць арганізацыі выхаваўчага працэсу на аснове “культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа” [1, с. 292]. Улічваючы неад’емнасць выхавання ад пазнавальнай дзейнасці, адзначанае патрабаванне надае асаблівую значнасць пытанням засваення вучнямі ведаў пра нацыянальную культуру.

Працэс актыўнага спасціжэння культуры свайго народа пачынаецца ў школьным узросце. Таму стварэнне спрыяльных умоў для абуджэння ў вучняў цікавасці да нацыянальнай культуры, імкнення да яе асваення з’яўляецца важнай задачай настаўніка пачатковых класаў. Адным з шляхоў яе вырашэння бачыцца актыўнае выкарыстанне экскурсій як формы работы, якая прадугледжвае непасрэднае знаёмства вучняў з прадметам вывучэння.

У нашай працы магчымасці экскурсій вывучаліся на базе 4 класаў (усяго 40 вучняў) ДУА “Сярэдняя школа № 13 г. Мазыра”. Дакументамі, якія арганізуюць адукацыйны працэс у 2022–2023 навучальным годзе, адзначаецца вялікі адукацыйны патэнцыял экскурсій і рэкамендуецца іх актыўнае правядзенне “з улікам прынцыпу тэрытарыяльнай даступнасці, а таксама неабходнасці ўключэння рэгіянальнага краязнаўчага кампанента

МГПУ им. И. П. Шамякина

ў адукацыйны працэс” [2, с. 10]. Адпаведна арганізацыя і правядзенне экскурсій зыходзіла з наяўнасці тых аб’ектаў нацыянальнай культуры, якія прадстаўляюць Мазыр і Мазырскі раён.

Для правядзення даследавання намі былі сфармуляваны крытэрыі і паказчыкі ацэнкі ведаў вучняў аб нацыянальнай культуры беларускага народа: інфармацыйна-пазнавальны крытэрый (веданне назваў беларускага нацыянальнага жылля, дэталяў інтэр’еру, прадметаў хатняга ўжытку, дэталяў беларускага нацыянальнага касцюма і інш.), эмацыянальна-каштоўнасны крытэрый (наяўнасць устойлівай эмацыйна афарбаванай цікавасці да нацыянальнай культуры беларускага народа), дзейнапрактычны крытэрый (уменне выкарыстоўваць наяўныя веды пра побыт беларускага народа ў самастойнай і практычнай дзейнасці).

Экскурсійная работа з вучнямі праводзілася пад дэвізам “Пазнай Беларусь” і ўключала ў сябе наступныя напрамкі:

а) знаёмства з гісторыяй і традыцыямі Беларусі. Навучэнцы наведалі “Мазырскі цэнтр нацыянальных культур і рамёстваў”, дзе атрымалі ўяўленне аб ткацтве, саломапляценні, лозапляценні, вышыўцы, пазнаёміліся з асаблівасцямі нацыянальных касцюмаў, мелі магчымасць паглядзець прадстаўленне батлеечнага тэатра;

б) знаёмства з геаграфіяй, архітэктурай беларускіх гарадоў. Навучэнцы школы ў перыяд канікул у ходзе пешых экскурсій знаёміліся з асаблівасцямі архітэктуры горада, знакавымі гістарычнымі месцамі, манументамі і помнікамі;

в) духоўна-маральнае выхаванне праз экскурсійную дзейнасць. Былі наведаны храмы г. Мазыра, музей “Палеская веда”, музей Тураўскай епархіі і інш.

Вынікі даследавання паказалі, што ў эксперыментальным класе паказчыкі ўзроўню ведаў вучняў аб нацыянальнай культуры беларускага народа прыкметна палепшыліся. У кантрольнай групе змены былі неістотнымі. Розніца ва ўзроўні ведаў вучняў аб нацыянальнай культуры беларускага народа двух класаў пасля правядзення праграмы дазваляе казаць пра тое, што з дапамогай граматна арганізаваных экскурсій можна дамагчыся значнага паляпшэння ўсіх паказчыкаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : 13 янв. 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 14.01.2022 г. № 154-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2022.

2. Аб арганізацыі ў 2022/2023 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс] : інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь // Нацыянальны адукацыйны партал. – Мінск, 2022.

МГПУ им. И. П. Шамякина